Выступленне біёграфа

Нарадзіўся Кастусь Каліноўскі 2 лютага 1838 года ў маленькай вёсачцы Мастаўляны Гродзенскага павета (цяпер гэта тэрыторыя Польшчы). У метрычнай кнізе мясцовага касцёла яго, сына Сымона Каліноўскага і Веранікі Каліноўскай (з Рыбінскіх), спачатку запісалі Вінцэнтам. Пазней дадалося імя Канстанцін. (Ём стане называць сябе Кастусь, як клікалі сялянскіх сыноў). Простае, мілагучнае імя. У старажытных рымлян яно азначала «непахісны», «трывалы», «цвёрды».

Дружная, вялікая сям’я (аж 13 дзяцей было ў бацькі) пазней пераязджае ў в. Якушоўка на Гродзеншчыне, амаль на голае месца. Праз нейкі час агульнымі намаганнямі сядзібу ўладкавалі і пачалі жыць хоць не заможна, але ў згодзе.

Вучыўся Кастусь у Свіслацкай гімназіі, дзе існавалі тайныя таварыствы, жыло вальнадумства. Там вучыліся вядомыя дзеячы беларускай, рускай і польскай культур, шмат хто з іх абраў рэвалюцыйны шлях (змаганне з царызмам).

Прайшоў час. Кастусь Каліноўскі едзе ў Пецярбург, дзе паступае на юрыдычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта. Гады ўніверсітэцкай вучобы (1856—1860) — вельмі важны перыяд для станаўлення дэмакратычнага светапогляду Каліноўскага. Тут ён знаёміцца з ідэямі рускіх і польскіх рэвалюцыйных дэмакратаў, прагна чытае «Современнннк», лісты герцэнаўскага «Колокола», становіцца адным з кіраўнікоў рэвалюцыйнага студэнцтва. Пецярбург бачыўся Кастусю Каліноўскаму галоўным апірышчам царызму, які прынёс нямала бед яго Радзіме. Каліноўскі на ўсё знаходзіць час: і на вучобу, і на тайныя сходкі, і на прыватныя ўрокі, якія даваў, каб здабыць сродкі на пражытак. Тут, у Пецярбурзе, ён становіцца перакананым прыхільнікам рэвалюцыйна-дэмакратычных ідэй, заклятым ворагам самадзяржаўя і прыгонніцтва. Выхадзец з небагатай шляхты, сын сваёй зямлі, ён востра адчуваў крыўду народную, боль і гора селяніна. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, К. Каліноўскі паспяхова скончыў у 1860 г. універсітэт і на пачатку наступнага года атрымаў дыплом кандыдата права.

Калі вясной 1861 г. ён вярнуўся на радзіму, на Беларусі, як ў Расіі і Польшчы, наспела рэвалюцыйная сітуацыя. Толькі што абвешчаная сялянская рэформа выклікала магутны ўздым сялянскіх хваляванняў. Неспакойна было і ў гарадах. Студэнты, навучэнцы, перадавыя вайскоўцы, дробная шляхта, рамеснікі выступалі ў падтрымку польскага нацыянальна-вызваленчага руху, які разгарнуўся з новай сілай. Беларусь і Літва разам з Польшчай імкліва ішлі да паўстання. Важаком «чырвоных» — радыкальных прыхільнікаў паўстання — і стаў Кастусь Каліноўскі. Ён лічыў сялянства асноўнай сілай паўстання, выступаў за рэвалюцыйны саюз усіх народаў супраць самадзяржаўя.